# ПАСЬЛЯСЛОЎЕ І ПОЗІРК У БУДУЧЫНЮ

Тры прэзыдэнцкія кампаніі, што адбыліся ў найноўшай гісторыі Беларусі, лучыць паміж сабой хіба што прозьвішча іх пераможцы. Кожная зь іх праходзіла ў адметны палітычны пэрыяд і падводзіла рысу пад эпохай у палітычным разьвіцьці краіны. Першыя прэзыдэнцкія выбары паклалі канец пэрыяду нацыянальна-адраджэнскага рамантызму і напаўдэмакратычнага безуладзьдзя першых гадоў незалежнасьці — калі можна так сказаць, «ваймарскаму» пэрыяду новай незалежнай дзяржавы. Другія выбары і «элегантная перамога» Лукашэнкі, якая, дарэчы, мала кім і аспрэчвалася, сталі фінальным акордам раньнелукашэнкаўскай эпохі, эры «мяккага» аўтарытарызму. Нарэшце, трэція выбары, магчыма, сталіся апошняй палітычнай падзеяй пэрыяду жорсткага лукашэнкаўскага аўтарытарызму: цалкам магчыма, што для наступнай палітычнай рэальнасьці, у якой неўзабаве апынецца Беларусь, тэрмін «аўтарытарызм» будзе ўжо залішне мяккі… Аднак палітычная кампанія, якая называлася «выбары прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь 2006 году», можа зрабіцца і адпраўным пунктам на шляху да крызісу і ўрэшце дэзынтэграцыі лукашэнкаўскага рэжыму. Зрэшты, перш чым рабіць прагнозы, трэба прааналізаваць, што адбылося.

А для гэтага трэба найперш вызначыцца з дэфініцыямі. Чым былі падзеі сакавіка 2006 г. — выбарамі, адміністрацыйнай працэдурай, няўдалай спробай рэвалюцыі? І наогул, у якой палітычнай рэальнасьці існавала Беларусь падчас гэтых падзеяў? Можна папанейшаму разглядаць яе як больш жорсткую і закрытую, чым раней, але ўсё яшчэ электаральную аўтакратыю — г. зн. недэмакратычны рэжым, які грунтуецца ня толькі на палітычных рэпрэсіях і злоўжываньні ўладай, але і на здольнасьці атрымліваць электаральную легітымнасьць. У такой сыстэме выбары не зьяўляюцца вольнымі і справядлівымі, але ўлада, хутчэй за ўсё, перамагала б на іх і тады, калі б яны былі такімі. З другога боку, апазыцыя мае пэўны прастор для дзейнасьці, і з гэтай прычыны выбары — нават не зусім сумленныя — гэта цэнтральная падзея ў палітычным жыцьці краіны, падзея, якая, калі справы пойдуць не паводле сцэнару ўлады, можа прывесьці да радыкальных палітычных зьменаў. Аналізуючы прэзыдэнцкія выбары, можна гаварыць пра стратэгію і тактыку кандыдатаў, ход і ўмовы агітацыі і галасаваньня, назіраньне і пасьлявыбарную стратэгію. У такім выпадку наш аналіз зводзіўся б да дыскусіі, чаму Лукашэнка выйграў, а апазыцыя прайграла ці, прынамсі, чаму адбылася або не адбылася электаральная рэвалюцыя.

Другі пункт гледжаньня такі: у Беларусі к вясьне 2006 году ўжо склаўся рэжым франкісцкага тыпу (як называўся лад, што панаваў у Гішпаніі за часамі Франка, чытач ведае), або, іншымі словамі, «карпаратыўная дзяржава», пра намер пабудаваць якую нядаўна заявіў намесьнік кіраўніка адміністрацыі Лукашэнкі спадар Праляскоўскі. У межах такога дзяржаўнага і сацыяльнага ладу няма ці амаль няма легітымнай прасторы для асабістай або калектыўнай палітычнай і сацыяльнай аўтаноміі. У структуры такой дзяржавы выбары могуць існаваць ці як вынік адсутнасьці іншых спосабаў легітымацыі існуючага ладу (інакш кажучы, у рэжыму проста няма ідэалёгіі, якая б абгрунтоўвала такі лад, пры якім выбары ўвогуле не праводзяцца), ці як вынік пэўных асаблівасьцяў рэжыму, абумоўленых некаторымі акалічнасьцямі біяграфіі і характару першай асобы, ці як адказ на выклікі часу і прасторы, у якіх (г. зн. у Эўро-

пе XXI стагодзьдзя) зусім не праводзіць выбараў неяк няёмка. Але выбары — гэта ўжо не ключавы, а хутчэй дэкаратыўны элемэнт палітычнага працэсу. Улада набывае легітымнасьць праз такія выбары не таму, што яе свабодна выбіраюць зь некалькіх альтэрнатыў, а таму, што яна прымушае грамадзтва пагадзіцца з тым выбарам, які сама і ўвасабляе. Уладар у такіх выбарах ня можа не перамагчы: урэшце, усё яго панаваньне накіраванае на тое, каб адміністрацыйная працэдура па пацьвярджэньні легітымнасьці пануючай сыстэмы адбылася беспраблемна. Такі характар панаваньня аўтар гэтых радкоў вызначае як «прэвэнтыўны аўтарытарызм» (калі замест слова «аўтарытарызм» паставіць больш жорсткі «-ызм», сутнасьць не памяняецца). Размовы пра перамогу ці паразу ў такім выпадку залішнія, бо зьмена сыстэмы можа настаць толькі ў выніку пазаінстытуцыйнага працэсу, у рамках якога выбары выступаюць хіба што нагодай, але не прычынай. Тады наш аналіз прымае форму развагаў пра тое, чаму гэты пазаінстытуцыйны працэс у сакавіку 2006 году распачаўся або не распачаўся.

Праяў «карпаратыўнай дзяржавы» ў сёньняшняй Беларусі дастаткова. Гэта, па-першае, інстытуцыяналізаваная абсалютная ўлада адной асобы і поўнае падначаленьне ўсяго дзяржаўнага апарату яе волі. Па-другое, гэта амаль поўнае скасаваньне прыватнай аўтаноміі і падпарадкаваньне асобы дзяржаве ў адміністрацыйным, эканамічным, сацыяльным, інфармацыйным і ўсё больш нават маральна-псыхалягічным пляне (пашырэньне атмасфэры сацыяльнага страху ад самой думкі, што наяўнае становішча можа калі-небудзь зьмяніцца). Па-трэцяе, гэта парадак рэчаў, пры якім непадпарадкаваньне ці нават нязгода зь дзяржавай, выказаныя публічна, зьяўляюцца легітымнай падставай для абмежаваньня грамадзянскіх правоў (такіх, як права на працу ці на адукацыю).

Менавіта на працягу другога лукашэнкаўскага тэрміну трансфармацыя беларускага рэжыму з электаральнай аўтарытарнай мадэлі ў карпаратыўную адбывалася імклівымі тэмпамі. Гэтая трансфармацыя паскорылася непасрэдна перад выбарамі. Адзначым толькі самыя базавыя этапы на гэтым шляху:

— амаль поўная дэлегалізацыя незалежнага трэцяга сэктару, непадкантрольных навучальных устаноў і г. д.;

— зачыстка інфармацыйнай прасторы шляхам закрыцьця або выжываньня незалежнай прэсы і засільля дзяржаўных электронных сродкаў масавай інфармацыі;

— увядзеньне кантрактнай сыстэмы на вытворчасьці і ва ўстановах;

— прасоўваньне т. зв. «дзяржаўнай ідэалёгіі»;

— стварэньне ў грамадзтве сыстэмы патранажу праз пашырэньне створаных ці «перахопленых» арганізацый (БРСМ, прафсаюзы).

На працягу апошняга году, часткова пад уплывам рэвалюцыйных падзеяў у постсавецкіх краінах, дадаліся:

— легітымацыя рэпрэсіўных паўнамоцтваў і фактычна беспакаранасьці сілавых структур (папраўкі да законаў аб унутраных войсках і г. д.);

— ізаляцыя найбольш актыўных слаёў грамадзтва ад замежных уплываў (дэкрэт пра барацьбу з гандлем людзьмі);

— легалізацыя прамога перасьледу за іншадумства і альтэрнатыўную дзейнасьць (новыя артыкулы Крымінальнага кодэксу, прынятыя ў сьнежні 2005 г.).

Акрамя таго, поруч з прававымі і інстытуцыйнымі карпаратывізм набывае і адметныя сацыяльныя рысы. Па-першае, гэта трансфармацыя грамадзкай культуры. Улада ўпарта спрабуе прышчапіць грамадзтву пэўную сыстэму каштоўнасьцяў, якая робіць любую ня толькі апазыцыйную, але і аўтаномную грамадзкую дзейнасьць амаральнай, такім чынам заганяючы нязгодных у культурную рэзэрвацыю. Лепш за ўсё гэта дэманстравалі стыль афіцыйнай прапаганды і атмасфэра падчас перадвыбарнай кампаніі, манера паводзінаў прадстаўнікоў рэжыму ў дачыненьні да ўсіх структур, якія яшчэ насьмельваліся адкрыта праяўляць нязгоду, а таксама адчуваньне татальнай беспакаранасьці з боку афіцыйных прапагандыстаў і карнікаў. Адбылася выпрацоўка новага маральнага коду ў грамадзтве, які ня толькі дазваляе, але і заахвочвае дзяржаўны і нават прыватны перасьлед іншадумцаў, пераводзячы такія дзеяньні ў катэгорыю сацыяльна чаканых.

Па-другое — гэта зьмены ў сацыяльнай базе рэжыму. Гаворка ідзе ня столькі пра колькасны, колькі хутчэй пра якасны стан. Напрыклад, моладзь, гарадзкое і адукаванае насельніцтва — ужо не такія выразныя антылукашысты, якімі яны былі яшчэ некалькі год таму. Зьмена пакаленьняў мела нечаканы для апазыцыйных тэарэтыкаў эфэкт: Лукашэнкаў электарат, замест таго каб натуральным шляхам адысьці, часткова папоўніўся генэрацыяй, якая нічога, акрамя Лукашэнкі, ня бачыла і ўспрымае прапанаваныя ім правілы гульні як нешта натуральнае ці, прынамсі, непазьбежнае. Аўтар гэтых радкоў памыліўся ў сваіх перадвыбарных прагнозах, кажучы, што гэтая моладзь «нічым сабе не пакажа» падчас гэтых выбараў. З аднаго боку, моладзь стаяла на Кастрычніцкай плошчы была ў палатачным гарадку. З другога — моладзь стаяла вакол плошчы, кідаючы ў «варанкі» тых, хто пратэставаў, арганізуючы правакацыі і здымаючы сюжэты пра наркотыкі і зьбіцьцё няшчасных амапаўцаў. Лукашэнкаў рэжым здолеў за дзесяцігодзьдзе якасна абнавіць сваю сацыяльную базу шляхам насаджэньня ў стасунках паміж дзяржавай і асобай прынцыпаў аўтарытарнага карпаратывізму, да таго як аб гэтым заявіў спадар Праляскоўскі. Інстытуцыялізацыя залежнасьці асобы ад улады ажыцьцяўлялася пры дапамозе як бізуна (кантрактная сыстэма, рэзкае абмежаваньне магчымасьцяў аўтаномнага існаваньня і незалежнай эканамічнай ды грамадзкай дзейнасьці, узмацненьне рэпрэсіўнасьці і павелічэньне жорсткасьці пакараньняў за іншадумства), так і перніка (распрацоўка адмысловай сыстэмы заахвочваньня палітычнай лаяльнасьці праз забесьпячэньне доступу да магчымасьцяў паляпшэньня матэрыяльнага становішча і кар’ернага росту), што прывяло да стварэньня ў грамадзтве шырокай кліентуры рэжыму, асабліва ў патэнцыяльна актыўных яго слаях.

І ўсё ж Беларусь пачатку 2006 году ўяўляла сабой усё яшчэ нейкі сымбіёз «карпаратыўнай дзяржавы» і электаральнага аўтарытарызму, хоць і зь яўным перакосам у бок першай мадэлі. Канчаткова гаварыць пра ўзьнікненьне цалкам кансалідаванага франкісцкага рэжыму можна было б у тым выпадку, калі б былі зьнішчаныя рэшткі магчымасьцяў для легітымацыі апазыцыі, якія заўжды

будуць існаваць, пакуль будуць праводзіцца канкурэнтныя (няхай нават толькі на выгляд) выбары, а таксама пакуль рэжым ня знойдзе такога спосабу легітымацыі, пры якім выбары яму стануць не патрэбныя. Калі адбываюцца выбары з чатырма кандыдатамі, зь якіх двое прадстаўляюць рэальную, некантраляваную рэжымам апазыцыю, тэарэтычна існуе магчымасьць страты рэжымам сваёй электаральнай легітымнасьці і старту працэсаў, што прывядуць да яго зьмены. Беларускія ўлады гэта цудоўна разумелі. Адсюль і такі перабор з рэпрэсіямі, што назіраўся на пачатку кампаніі і пасьля яе, адсюль і яўная нэрвовасьць першай асобы, адсюль і надзвычай жорсткія законы, прынятыя ў канцы 2005 году. З другога боку — сыстэма ня раз, як той казаў, завісала: з пункту гледжаньня, як кажуць у Расеі, «паняцій» усё зразумела — нязгодных трэба мачыць, але тут зьяўляюцца нейкія афіцыйныя пасьведчаньні сяброў ініцыятыўных групаў, улёткі з рэгістрацыйнымі данымі і цалкам дазволеныя антылукашэнкаўскія прамовы на БТ. Вось гэтая неадпаведнасьць фармальнага і фактычнага і стварала тую шчыліну, у якую яшчэ маглі ўлезьці апазыцыянэры. Урэшце, уладзе так яшчэ і не ўдалося трансфармаваць грамадзтва да такой ступені, што зьнікае сама гаворка пра магчымыя злоўжываньні падчас выбараў — злоўжываньняў не назіраецца, таму што грамадзтва цалкам страчвае магчымасьці і сілы для нейкага арганізаванага супраціву.

У сваю чаргу, апазыцыя ў момант абвяшчэньня прэзыдэнцкіх выбараў ужо апынулася ў дысыдэнцкім становішчы. Удакладнім: яе яшчэ нельга было назваць цалкам дысыдэнцкім асяродкам — для гэта яна аказалася празьмерна разгалінаванай і нечакана дзеяздольнай, — але па мерках сапраўды моцнай апазыцыі, здольнай змагацца за рэальную ўладу, яна была, як мінімум на пачатку кампаніі, дэзарганізаванай і малаэфэктыўнай — падкрэсьлім, не па сваёй віне, ці ня столькі па сваёй. У такім становішчы для апазыцыі непазьбежна ўзьнікала дылема — якую форму кампаніі і які стыль паводзінаў выбраць. Або апазыцыйны — змаганьне за ўладу ці яго імітацыя ў фармаце выбараў (так званая *issue-oriented* кампанія, спробы дацягнуцца да электаральнага «балота», пазьбяганьне дзеяньняў, што маглі б адштурхнуць нэйтральны ці чужы электарат, пошукі

шляхоў аб'яднаньня, каб «не расьцягнуць галасы», і г. д.), або дысыдэнцкі — выкарыстаньне выбараў у першую чаргу для агітацыйнай кампаніі, арыентацыя на працэс бяз клопату пра канчатковы вынік. Магчыма і трэцяя альтэрнатыва: выкарыстаньне выбараў выключна як дымавой заслоны для пазаінстытуцыйных дзеяньняў — іншымі словамі, для рэвалюцыі, зь якой ужо ня лучацца прыметнікі «электаральная» ці «аксамітная», — аднак да такіх дзеяньняў апазыцыя была загадзя і яўна не гатовая, а ўмоваў для іх ажыцьцяўленьня адпачатку не існавала. Нельга сказаць, што кампаніі абодвух апазыцыйных кандыдатаў — і Аляксандра Мілінкевіча, і Аляксандра Казуліна — цалкам адпавядалі адной з гэтых мадэляў, але дысыдэнцкі элемэнт у іх праглядваўся вельмі выразна.

Сапраўды, шмат што ў паводзінах абодвух апазыцыйных кандыдатаў было антыподам «звычайнай» перадвыбарнай кампаніі, арыентаванай на вынік і перамогу. Абодва кандыдаты завастралі ўвагу грамадзтва ня столькі на сваёй праграме, колькі на крытыцы свайго галоўнага канкурэнта і ўсяго рэжыму ўвогуле. Абодва гаварылі ня столькі аб прагматычных рэчах (г. зн. аб тым, што ў першую чаргу хвалюе насельніцтва), колькі аб ідэалягічных — такіх, як свабода і дэмакратыя. Дый сам фармат удзелу двух кандыдатаў ад апазыцыі прывёў да нечаканых вынікаў. Замест размываньня дэмакратычнай альтэрнатывы, пра якую аўтар гэтых радкоў памылкова разважаў перад пачаткам агітацыі, фармат «1+1» прывёў да больш выразнай яе артыкуляцыі. З аднаго боку, улады проста не далі Мілінкевічу і Казуліну часу і магчымасьцяў высьвятляць адносіны паміж сабой. З другога — як аказалася, уладам больш непрыемнасьцяў прыносіла не пэрспэктыва канцэнтрацыі ўсіх апазыцыйных галасоў у адным кошыку, а неабходнасьць выдзеліць па дадатковай гадзіне тэле- і радыёэфіру на крытыку саміх сябе.

У такіх нелягічных паводзінах усё ж такі была свая лёгіка. Ад пачатку кампаніі было зразумела, што для апазыцыі гуляць на выйгрыш па лякалах звычайных выбараў немагчыма і бессэнсоўна: гэта ператварылася б хіба ў кампанію Ганчарыка (у стылі «і нашым і вашым») дубль два. У спробах весьці ардынарную кампанію, абапіраючыся на тыя пытаньні, што маглі б «прыцягнуць элек-

тарат», было таксама мала сэнсу: пратэстныя настроі ў грамадзтве слабыя, пытаньні чаркі, скваркі і стабільнасьці прыносілі ў сёньняшнім сацыяльна-палітычным кантэксьце ачкі толькі Лукашэнку. Акрамя таго, перш чым нават заводзіць гаворку пра заваёву большасьці, апазыцыі трэба пачынаць з кансалідацыі сваіх унутраных радоў і ядра сваіх сацыяльных прыхільнікаў. Трэба сказаць, што з гэтымі задачамі яна нарэшце, за дванаццаць гадоў Лукашэнкавага панаваньня, збольшага справілася — перш за ўсё таму, што ў яе зьявіліся два выразныя, рэйтынгавыя лідэры, якія змаглі заручыцца даверам і падтрымкай незалежнай грамадзкасьці. Дзякуючы гэтаму дэмакратычная субкультура, калі можна так сказаць, праявілася настолькі, што адмаўляць факт яе існаваньня ўжо ня могуць нават лукашысты.

Аднак дасягненьні апазыцыі падчас цяперашняй кампаніі — гэта ўсяго толькі міні-вынікі, дзеля якіх апазыцыі ў цяперашніх умовах спатрэбілася прыкласьці максі-высілкі. Скажам шчыра, кансалідацыя апазыцыі запазьнілася гадоў гэтак на дзесяць-дванаццаць. І прыказка «лепш позна, чым ніколі» тут не зусім пасуе: позна ўжо настолькі, што ад самога факту кансалідацыі палітычны вынік гэтых выбараў ужо не залежаў. І ўсё ж іншы вынік выбараў быў цалкам зьвязаны з фактам кансалідацыі і, не пабаімся сказаць пра гэта, узмацненьнем ды сталеньнем дэмакратычных сілаў. Гэта пачатак рэвалюцыі духу — як мінімум у сэгмэнце дэмакратычнай субкультуры.

Дзясяткі тысячаў, што выйшлі на Кастрычніцкую плошчу (ці, як яе ўжо многія для сябе перайменавалі, плошчу Каліноўскага), канечне ж, не прадстаўлялі ўсяго беларускага грамадзтва. Колькасьць пратэстуючых у самы пік вулічнага супраціву не перавышала маштабаў пратэстаў у сярэдзіне 1990-х гадоў. Да пералому на карысьць ідэй свабоды і зьменаў у грамадзтве ў цэлым яшчэ далёка. Сацыяльны балянс пакуль на карысьць Лукашэнкі, і кампанія наўрад ці яго зьмяніла. Дый колькасьць пратэстуючых была, паводле слоў кіраўніка Мілінкевічавага штабу Сяргея Калякіна, у дзесяць (ну, можа, на самай справе ў пяць) разоў меншая за тую, якая была б патрэбна, каб улада пахіснулася. Але ж гэтая коль-

касьць аказалася разоў у дзесяць большай за тую, якую прадказвалі большасьць аналітыкаў напярэдадні падзеяў, асабліва пасьля таго, як патэнцыяльным удзельнікам пратэсту прыгразілі сьмяротнай карай. У 1996 годзе нас мабілізаваў страх страціць незалежнасьць. У 2006 годзе нас яднае прага свабоды і годнасьці. Тое, што гэта магчыма, што менавіта свабода, а ня нейкія сацыяльныя пытаньні стануць мабілізуючым чыньнікам у супрацьстаяньні Лукашэнкаваму рэжыму, таксама многімі ставілася пад сумненьне. Як высьветлілася, дарма. Больш за тое, уражвае роля, якую адыгралі падчас пратэстаў нацыянальныя сымбалі, пачуцьці, сьвятыні. Бела-чырвона-белыя сьцягі, Звон і песьні свабоды, партрэты Каліноўскага надалі грамадзянскаму чыну пэўны дух, якога былі цалкам пазбаўлены шматлікія спробы вывесьці людзей на вуліцы пад лёзунгамі «лепшага жыцьця» і да т. п. Так, можа, нацыянальная афарбоўка і сама ідэалёгія свабоды шмат каго і адштурхоўвае, паглыбляе раскол у грамадзтве. Аднак прыхільнікам «чыстай» дэмакратыі за дзесяцігодзьдзе барацьбы з аўтарытарызмам так і не ўдалося стварыць гэткай мабілізуючай альтэрнатывы, якую мы назіралі і на працягу «Менскай вясны», і падчас пахаваньня Васіля Быкава, і цяпер.

Аднак трэба адзначыць, што пратэст на Кастрычніцкай плошчы быў хутчэй дысыдэнцкім чынам «у асабліва буйных памерах», як любілі казаць за саветамі, а ня формай барацьбы за ўладу: ён уражваў, кагосьці захапляў і натхняў, а камусьці даваў нагоду для кпінаў са сваёй нелягічнасьці ды ірацыянальнасьці. Гэтая ірацыянальнасьць была абумоўлена ня столькі непрадуманасьцю і нескаардынаванасьцю дзеяньняў апазыцыі, колькі жорсткай і трывалай палітычнай рэчаіснасьцю: рэвалюцыйныя дзеяньні адбываліся ва ўмовах, калі адсутнічала рэвалюцыйная сытуацыя як у сацыяльным аспэкце (вярхі яшчэ відавочна «могуць», а нізы пераважна «хочуць»), так і ў больш паліталягічным. Пад апошнім маецца на ўвазе тое, што не было канфлікту легітымнасьцяў, а больш простымі словамі — апазыцыя не аб’явіла пра сваю перамогу. Прэтэнзій на ўладу Мілінкевіч (а тут я гавару толькі пра Мілінкевіча — яго палітычная вага на той момант была значна большай) не прад’явіў. Рацыя-

нальнымі паводзінамі ў такіх абставінах было б не выходзіць на вуліцу, а калі і выйсьці, то хутка разысьціся, да пачатку «хапуну» з боку спэцпадразьдзяленьняў. Так і адбылося, дарэчы, у 2001 годзе. Што на самай справе магло кіраваць людзьмі, якія чатыры дні і ночы знаходзіліся ў палатачным гарадку? Вера ў перамогу тут і цяпер? Наўрад ці, яе якраз і не было, і дэмакратычныя актывісты гэта разумелі. Імкненьне дамагчыся больш справядлівых, з пункту гледжаньня пратэстуючых, вынікаў выбараў (скажам, за Лукашэнку 55 %, а за Мілінкевіча 30 %)? Зноў сумнеўна, бо нават пры такіх лічбах рэжым застаўся б (а яго апанэнты запраграмавана атрымалі б сваю долю амапаўскай увагі за пратэст) і, больш за тое, прыдбаў бы пэўныя рысы легітымнасьці. Выходзіць, адно — жаданьне гучна заявіць пра сябе, пра сваё існаваньне, паслаць сыгнал грамадзтву і запэўніць саміх сябе ва ўласнай няскоранасьці. З пункту гледжаньня простага беларуса і наогул рацыянальнага чалавека, такая матывацыя вельмі ірацыянальная, а з пункту гледжаньня палітоляга — цалкам дысыдэнцкая. Аднак на падобныя ірацыянальныя і дысыдэнцкія дзеяньні ў 2006 годзе выйшла ўражальная колькасьць людзей (асабліва ў першую ноч пратэсту), і яны пратрымаліся столькі, каб пакінуць сьлед у найноўшай гісторыі Беларусі, усю важнасьць якога можна будзе ацаніць хіба праз пакаленьне. Сапраўды, палітычная барацьба вымагае рацыяналізму. Легенда ж змаганьня, што падсілкоўвае наступныя пакаленьні, складаецца з ірацыянальных дзеяньняў. Для будучыні беларускай дэмакратыі імкліва ліквідуецца дэфіцыт легенды, дэфіцыт прыкладу, што зьведваюць сёньняшнія генэрацыі беларускіх актывістаў, якім, у адрозьненьне ад чэскіх, польскіх і нават украінскіх калег, даводзілася пачынаць без уласных прыкладаў «Салідарнасьці» і «Хартыі-77». Апроч таго, праявіліся акалічнасьці, зьвязаныя са станам дэмакратычнай субкультуры, пра якія да апошніх падзеяў мала хто задумваўся.

Па-першае, па меры павелічэньня жорсткасьці палітычнага клімату ў краіне адбылася таксама пэўная радыкалізацыя нездаволеных уладай. Радыкалізацыя гэтая, канечне, частковая, таму што яе зьведала толькі пэўная частка грамадзтва — тыя, каго закранулі рэпрэсіі, а

таксама тыя, каму існуючыя парадкі не дазваляюць задаволіць пэўныя жыцьцёвыя запатрабаваньні і ідуць уразрэз з базавымі каштоўнасьцямі. Гэта значыць гаворка пакуль ідзе толькі пра субкультуру. На сёньняшні дзень, як гэта ні парадаксальна, у рэпрэсіі ўцягваюцца ўсё шырэйшыя колы ўлады і нават грамадзтва, але накіраваныя яны ўсё яшчэ супраць даволі абмежаванай сацыяльнай праслойкі. Аднак гэтая праслойка аказалася не такой ужо і малой, і, больш за тое, падзеі выразна прадэманстравалі, што яна мае пэрспэктыву для росту і разьвіцьця.

Па-другое, падзеі па прэзыдэнцкіх выбарах засьведчылі на дзіва высокі патэнцыял выжывальнасьці і самаарганізацыі амаль цалкам дэлегалізаванай грамадзянскай супольнасьці. Гэты патэнцыял быў асабліва заўважны на фоне непаваротлівай палітычнай апазыцыі, якая пасьля 19 сакавіка саступіла лідэрства менавіта прадстаўнікам трэцяга сэктару. Дысбалянс паміж палітычнай апазыцыяй і грамадзянскай супольнасьцю ва ўмовах Беларусі закладваўся даўно і нічым новым ня стаўся. З аднаго боку, трэці сэктар з прычыны пэўных акалічнасьцяў заўсёды прыцягваў больш здольных, таленавітых і адданых працы актывістаў; з другога — не сакрэт, што ў палітычнай апазыцыі ўжо даўно існавала нефармальная структура лідэрства, засяроджаная менавіта на структурах грамадзянскай супольнасьці. Апроч таго, у пасьлявыбарных падзеях у фармаце электаральнай рэвалюцыі першую скрыпку заўсёды іграе менавіта трэці сэктар — акурат ён адыгрывае галоўную ролю ў мабілізацыі грамадзтва. Безумоўна, роля, якую ў гэтым выпадку мусіць выканаць палітычная апазыцыя, таксама незаменная. Аднак яна заключаецца, па-першае, у стварэньні «канфлікту легітымнасьцяў» — артыкуляцыі прэтэнзій на ўладу ў выніку выбараў, па-другое, у вызначэньні на падставе вылучэньня гэтых прэтэнзій палітычных мэтаў пратэсту і, па-трэцяе, у нэйтралізацыі карнага апарату ўладаў. Але паколькі канфлікту легітымнасьцяў стварыць не ўдалося, то менавіта палітычная апазыцыя ў падзеях пасьля 19 сакавіка, як кажуць, «завісла» і аказалася на абочыне працэсу. Менавіта гэта і спрычыніла нелягічны, дысыдэнцкі характар падзеяў на Кастрычніцкай плошчы. Аднак незалежна ад гэтага фактару

пратэст паказаў неадэкватнасьць існуючай структуры палітычнай апазыцыі (арганізаванай праз ідэалягічныя палітычныя партыі) настроям і памкненьням больш шырокай апазыцыйнай супольнасьці. Акрамя таго, аддаючы даніну павагі мужнасьці партыйных лідэраў, што мусілі прайсьці праз турмы, трэба ўсё-такі адзначыць і той факт, што іх нэйтралізацыя ніяк не перашкодзіла ўзьнікненьню пратэсту і працэсам самаарганізацыі апазыцыйнай супольнасьці.

Па-трэцяе, імпульс, зададзены эскаляцыяй палітычнай напружанасьці напярэдадні і пасьля 19 сакавіка, часткова перанёсься і на тыя апазыцыйна настроеныя колы грамадзтва, якія раней не былі ангажаваныя ў актыўную палітычную дзейнасьць, і прывёў да ўзьнікненьня новых, спантанных формаў самаарганізацыі. Вялікая колькасьць удзельнікаў пратэсту і тых, хто прайшоў праз ізалятары на Акрэсьціна і ў Жодзіне, зусім не належалі да традыцыйнай апазыцыйнай тусоўкі. Адбывалася самаарганізацыя праз інтэрнэтфорумы, мелі месца спарадычныя спробы прыклаcьці высілкі для прабіцьця інфармацыйнай блякады (праз стварэньне прыватных вэбсайтаў і самастойнае тыражаваньне і распаўсюджваньне інфармацыі), набывалі пашырэньне новыя, пакуль што незвычайныя для Беларусі формы пратэсту і работы з насельніцтвам (такія, як флэшмобы). На парадку дня пытаньне, як інтэграваць гэтыя спантанныя формы самаарганізацыі і грамадзкай самадзейнасьці з традыцыйнымі структурамі ды дзеяньнямі грамадзянскай супольнасьці.

Па-чацьвёртае, «citius paribus», інфармацыйная блякада, у якую Лукашэнкаў рэжым загнаў беларускае грамадзтва, у прынцыпе прабівальная. Выбарчая кампанія і падзеі пасьля яе засьведчылі патэнцыял Інтэрнэту ў ліквідацыі інфармацыйнага дэфіцыту і спрыяньні самаарганізацыі грамадзянскай супольнасьці (з аднаго боку, наведваньне традыцыйных сайтаў, што падаюць альтэрнатыўную інфармацыю, павялічылася ў некалькі разоў і дасягнула вельмі рэспэктабэльных некалькіх дзясяткаў тысячаў заходаў у дзень; з другога, неарганізаваная і стыхійная грамадзянская актыўнасьць арганізоўвалася найперш праз Інтэрнэт). Канечне, далёкасяжныя вывады рабіць рана. Хоць і можна ўявіць, што ў будучыні колькасьць карыстальнікаў Інтэрнэту будзе імкліва расьці, гэты сродак

інфармацыі ўсё ж паддаецца блякаваньню і цэнзуры. Акрамя таго, тыя сацыяльныя слаі, што не ўяўляюць жыцьця без Лукашэнкі, ад гэтага сродку інфармацыі адрэзаныя.

Але героіка і патэтыка ў будучыні ня так прыемна выглядаюць у кароткатэрміновай пэрспэктыве: сёньняшнія змагары для вялікіх колаў уласнага грамадзтва — пакуль што толькі зграя падкупленых адмарозкаў, якія карыстаюцца наркотыкамі, прадаюць сэкспаслугі праз Інтэрнэт і зьбіваюць падначаленых спадара Паўлічэнкі. Халодная, часам варожая, а галоўным чынам абыякавая рэакцыя грамадзтва (па-за межамі дэмакратычнай субкультуры) на падзеі на Кастрычніцкай плошчы — гэта і паказчык таго, якая бездань пакуль што аддзяляе як паплечнікаў апазыцыі ад прыхільнікаў рэжыму, так і Беларусь увогуле ад дэмакратыі. Чаму гэтая бездань існуе? Чаму, скажам, у Кіеве на Майдан імкнуліся сотнямі тысячаў, а ў Менску ад яго шарахаліся? Чаму там гарадзкія ўлады забясьпечвалі пратэстуючых усім неабходным, а тут — дапамагалі АМАПу выжываць іх? Чаму на поўдні да Майдану далучылася амаль уся культурная і інтэлектуальная эліта, а ў нас — толькі адзінкі, у той час як астатнія раілі «слухаць бацьку»? Чаму ў Кіеве ўнівэрсытэты адмянялі заняткі, каб адпусьціць студэнтаў на Майдан, а ў Менску іх па-езуіцку выганяюць? І яшчэ дзясяткі «чаму?». Адказы, здаецца, відавочныя, і ўсе яны слушныя. Тут і фактар страху, і вынік інфармацыйнай апрацоўкі, і праявы сацыяльнай апатыі, і безумоўная наяўнасьць у рэжыму сацыяльнай базы.

Аднак ёсьць яшчэ адзін чыньнік, на якім варта засяродзіць увагу. Гэта — нацыянальная некансалідаванасьць. Гаворачы пра нацыю, мы маем на ўвазе ня толькі стаўленьне да мовы, культуры, гісторыі, нацыянальных сымбаляў і г. д. (хаця менавіта стаўленьне да сымбаляў і гістарычна-культурнай спадчыны выпрацоўвае — або не выпрацоўвае — культурныя нормы, што робяць маральна непрымальнымі сьветапоглядныя падставы, на якіх грунтуецца лукашэнкаўская ўлада). Іншы аспэкт нацыянальнай кансалідацыі — гэта адносіны грамадзян адзін да аднаго, тое, што стварае грамадзкую салідарнасьць. Папросту кажучы, гэта калі кожны, нават незалежна ад палітычных перакананьняў, бачыць у любым зьняво-

леным уласнага сваяка, успрымае кожны факт хлусьні, гвалту, зьбіцьця дзяўчат ці старых як уласную абразу, як гвалт над сваім сынам ці ўнукам. На сёньняшні дзень — і сакавік 2006 году гэта засьведчыў — праявы такой салідарнасьці можна ўбачыць толькі ў рамках усё той жа дэмакратычнай субкультуры. Асабліва падчас падзеяў 25 сакавіка каля музычнага тэатру ў Менску стала зразумелым, які выклік кідае ўлада (у асобе спадара Паўлічэнкі і шыхтоў яго падначаленых) грамадзтву. І грамадзтва пакуль што дало на гэты выклік, мякка кажучы, пасіўны адказ. Дзеці, якім пераламалі рэбры і разьбілі твары, усё яшчэ ўспрымаюцца звычайным абывацелем як чужыя дзеці, пра якіх ня варта клапаціцца.

Фактычна шанец на дэмакратыю ўзьнікне ў Беларусі тады, калі, нягледзячы на палітыку Лукашэнкі і рэаліі яго «карпаратыўнай дзяржавы», нацыя ўсё ж такі паўстане як антыпод лукашэнкаўскага бачаньня сьвету, іншых і саміх сябе. Нацыі звычайна ствараюцца элітамі, якія ўжо авалодалі ўладай. Ці ўдасца гэта зрабіць апазыцыі, да таго ж ва ўмовах існаваньня ў палітычным гета? У сілу зразумелых абставінаў ёй будзе, безумоўна, вельмі цяжка насадзіць у грамадзтве ідэалягічны, сьветапоглядны складнік свайго нацыянальнага праекту, сваё разуменьне беларушчыны — тое, што завецца палітычна-гістарычным дыскурсам. Аднак яна можа і мусіць узмацняць і падтрымліваць адчуваньне грамадзкай салідарнасьці, якую пачала праяўляць падчас сакавіцкіх падзеяў дэмакратычная субкультура.

Нацыянальнае будаўніцтва ў рэаліях лукашэнкаўскай Беларусі — гэта найперш падтрымка любых незалежных, нават спантанных, ініцыятываў, што мацуюць гэтую салідарнасьць. Кожная коўдра ці паліто, прынесеныя на Акрэсьціна, кожны кубак гарбаты, зроблены для жыхароў палатачнага гарадка на Кастрычніцкай плошчы, кожны тэлефонны званок родным тых, хто сядзеў у пастарунках, — гэта маленькі ўклад ў стварэньне нацыі. Гэтаксама як кожная ўлётка, кінутая ў паштовую скрыню суседа, кожная спроба пагутарыць з тымі, хто ня згодзен ці вагаецца, кожная новая ідэя флэшмобу — гэта мацаваньне тых гарызантальных сувязяў паміж грамадзянамі, зь якіх нацыя і павінна стварыцца. Тыя праявы спантаннай незалеж-

най самаарганізацыі, якія мы маглі назіраць апошнім часам, хутка сыдуць на нішто, калі наяўныя дэмакратычныя сілы, іх палітычны і грамадзянскі кампанэнты, ня знойдуць магчымасьцяў інтэграваць або інтэгравацца з гэтай новай, яшчэ толькі ўзьнікаючай грамадзянскай супольнасьцю. Пытаньняў тут сапраўды шмат, і адно з галоўных зь іх — як спалучыцца гэтае спантаннае незалежнае грамадзтва з гіерархічнай партыйнай арганізацыяй існуючай апазыцыі.

Акрамя таго, такое будаўніцтва немагчыма і без праяваў салідарнасьці ды наладжваньня сувязяў з той часткай грамадзтва, якое глядзіць на дэмакратычную субкультуру або як на ворагаў, або як на наіўных летуценьнікаў. Таму апазыцыі і незалежнаму грамадзтву трэба як мага больш узмацніць работу з насельніцтвам, рэагаваць на любы канфлікт ці напружанасьць, заступацца за любога пакрыўджанага, наладжваць кантакты зь любымі аўтаномнымі асяродкамі, перапісаць талмуды сваіх праграм у некалькі радкоў канкрэтных і зразумелых прапаноў і патрабаваньняў — наогул, усімі сіламі паказваць, што палітычныя зьмены будуць асабістай перамогай кожнага.

Зразумела, рабіць гэта, калі за любую незалежную дзейнасьць сьвеціць да трох год турмы, калі незалежнай прэсы ўжо амаль няма і калі наступны збой у сыстэме ў выглядзе чарговых выбараў яшчэ далёка, будзе цяжка. Высілкі ўладаў на найбліжэйшы час будуць накіраваныя менавіта на разбурэньне грамадзкай салідарнасьці і падаўленьне любых яе праяваў. Наогул, калі гаварыць пра ўладу, яна пакуль што знаходзіцца ў тым стане, у якім яе стабільнасьць могуць пахіснуць хіба што ўласныя памылкі, а не знадворныя ўзьдзеяньні. Таму яна будзе і надалей дзейнічаць прэвэнтыўна, гэта значыць зьнішчаць патэнцыяльныя пагрозы да таго, як яны перарастуць у рэальныя. Аднак варта памятаць і адзін з урокаў, якія даў сакавік 2006-га: небывала жорсткія прэвэнтыўныя дзеяньні рана ці позна прыводзяць да мабілізацыі і радыкалізацыі апазыцыі ды незалежнага грамадзтва — часам у самыя нечаканыя моманты. Рэпрэсіі таксама павышаюць прагу да свабоды, асабліва калі яны ахопліваюць усё новыя слаі насельніцтва.

Ёсьць яшчэ адна важная акалічнасьць: апошнія падзеі прадэ-

манстравалі, які ўплыў на далейшае разьвіцьцё палітычнай сытуацыі будзе мець псыхалягічны стан першай асобы. Часам, асабліва падчас прамовы другога сакавіка, нават здавалася, што Лукашэнкавы страхі перавышаюць той страх, які апанаваў беларускае грамадзтва ў цэлым. Іншымі словамі, працягваючы змаганьне, нават проста заяўляючы пра сваё існаваньне, дэмакратычнае грамадзтва ў такіх умовах павялічвае выдаткі рэжыму — арганізацыйныя, матэрыяльныя, фізычныя і псыхалягічныя — на яго падтрыманьне. Нэрвовасьць наверсе непазьбежна перадасца ўніз па прэзыдэнцкай вэртыкалі, адчуваньне магчымай разьвязкі зь цягам часу ня можа не нарастаць. Гэтыя рэчы непазьбежныя, як старэньне і сьмерць чалавека.

Аднак тое, што нельга прадухіліць, канечне, можна запаволіць; таму, магчыма, некаторыя прагнозы аналітыкаў наконт таго, што для Лукашэнкі ўжо пачаўся зваротны адлік, пакуль што заўчасныя. Што можа паскорыць іх рэалізацыю? Можна разважаць пра эканамічныя варункі, новыя газавыя войны з Расеяй, іншыя рэчы, але для аўтара гэтых радкоў відавочна, што калі ў структуры арганізацыі сёньняшняй улады захаваецца такі «глюк», як выбары (як мінімум такія, як апошнія) — гэтая бомба запаволенага дзеяньня, якая руцінна прыводзіць да абвастрэньня грамадзкага супрацьстаяньня, — то рана ці позна адбудзецца збой. Калі ж не захаваецца, нават без фармальнай адмены саміх выбараў (можна ж унесьці невялікую папраўку, зрабіўшы так, што акрамя Лукашэнкі ў выбарах зможа браць удзел, скажам, толькі спадар Гайдукевіч), то працэсы, якія прывядуць да трансфармацыі існуючага ладу, будуць больш доўгімі, менш відавочнымі і амаль зусім некіраванымі з боку альтэрнатыўных сілаў. Што будзе насамрэч, прадказаць цяжка. Але відавочна, што рысу пад палітычнай гісторыяй найноўшай Беларусі ды пад барацьбой паміж дыктатурай і дэмакратыяй падводзіць яшчэ рана. Па вялікім рахунку, яна толькі пачынаецца.